# Развіццё прамысловасці і ўзровень жыцця насельніцтва БССР у 1951–1953 гадах

УДК [94+67/68+36](476)«1951/1953»



**Мікалай НЕСЦЯРОВІЧ, кандыдат гістарычных навук**

Мікалай НЕСЦЯРОВІЧ. Развіццё прамысловасці і ўзровень жыцця насельніцтва БССР у 1951–1953 гадах. У артыкуле аналізуюцца асноўныя тэндэнцыі і паказчыкі развіцця прамысловасці беларускай рэспублікі, у тым ліку ў параўнанні з папярэднім перыядам, а таксама ўзровень жыцця ў БССР у пачатку 1950-х гадоў. Даецца ацэнка ўплыву развіцця прамысловасці на ўзровень матэрыяльнага дабрабыту насельніцтва.
Ключавыя словы: прамысловасць, прамысловае развіццё, тэмпы развіцця, пяцігодка, вытворчасць, узровень жыцця.

Mikalai NESTSIAROVICH. Industrial development and living standards in the BSSR in 1951–1953. The article examines the industrial development and the living standards in the Belarusian SSR in the early 1950s. The author analyzes the main trends and indicators of the development of the republic's manufacturing sector, including in comparison with the previous period and gives an assessment of its impact on the level of material well-being of the population.
Keywords: industry, industrial development, pace of development, five-year plan, production, living standards.

## Сацыялістычнае спаборніцтва як сродак павелічэння вытворчасці

Гістарычны вопыт паказвае: прамысловы патэнцыял – аснова дзяржаўнага суверэнітэту, у сувязі з гэтым вывучэнне станаўлення прамысловага комплексу БССР, на наш погляд, і сёння застаецца актуальным. У гісторыі развіцця прамысловасці БССР важным этапам была пятая пяцігодка 1951–1955 гадоў, вынікі якой у беларускай гістарыяграфіі вывучаны недастаткова глыбока. Асабліва гэта датычыцца этапа 1951–1953 гадоў, які ў немалой меры стаў вызначальным для фарміравання індустрыі Беларусі.

### ПРА АЎТАРА

НЕСЦЯРОВІЧ Мікалай Барысавіч.

Нарадзіўся ў 1959 годзе ў г. Чарамхове Іркуцкай вобласці Расійскай Федэрацыі. Скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт (1981), аспірантуру Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР (1989).

У 1981 годзе працаваў настаўнікам гісторыі ў Бор-Дубянецкай васьмігадовай школе Столінскага раёна, потым выкладчыкам гісторыі, грамадазнаўства і савецкага права Столінскага сельскагаспадарчага тэхнікума. З 1989 года – у Інстытуце гісторыі НАН Беларусі: малодшым навуковым супрацоўнікам аддзела гісторыі сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР, навуковым супрацоўнікам групы па вывучэнню сталінскіх рэпрэсій, старшым навуковым супрацоўнікам аддзела сацыяльна-эканамічнай і палітычнай гісторыі Беларусі, аддзела навейшай гісторыі. З 2018 года – вядучы навуковы супрацоўнік аддзела навейшай гісторыі Беларусі.

Кандыдат гістарычных навук (1990).

Аўтар больш чым 140 навуковых і навукова-папулярных публікацый.

Сфера навуковых інтарэсаў: пытанні эканамічнай гісторыі Беларусі, развіцця яе нацыянальнай дзяржаўнасці ў савецкі і постсавецкі час.

У выніку выканання ў 1946–1950 гадах чацвёртага пяцігадовага плана развіцця народнай гаспадаркі Беларуская ССР, дасягнуўшы, як і ўвесь СССР, бясспрэчных поспехаў у аднаўленні прамысловасці, стварыла даволі істотную базу для далейшага нарошчвання індустрыяльнага патэнцыялу. Аднак рост агульнага аб'ёму прадукцыі беларускай прамысловасці ў канцы пяцігодкі ў параўнанні з даваенным 1940 годам быў значна меншым, чым у цэлым па СССР: ён павялічыўся толькі на 15 % *[1, с. 35]*, тады як агульнасаюзны паказчык склаў 73 % *[2, с. 1]*. Акрамя таго, паводле звестак ЦСУ БССР, у 1950 годзе валавая прадукцыя прамысловасці Гомельскай вобласці ў параўнанні з 1940 годам склала 96 %, а Віцебскай – 57 % *[3, с. 14]*. Да канца пяцігодкі тэхнічны і арганізацыйны стан галін прамысловасці Беларусі знаходзіўся на нізкім узроўні, некаторыя з іх яшчэ не былі адноўлены. Адчуваўся востры дэфіцыт у энергазабеспячэнні, недахоп жылля, тавараў народнага спажывання.

Наперадзе была вялікая праца па далейшым развіцці прамысловасці краіны, што павінна было ў большай ступені садзейнічаць росту ўзроўню жыцця насельніцтва. Яно адбывалася ў адпаведнасці з задачамі, пастаўленымі чарговым, пятым пяцігадовым планам развіцця народнай гаспадаркі Беларускай ССР на 1951–1955 гады, які быў зацверджаны пастановай Савета Міністраў БССР і ЦК КП(б)Б 23 лютага 1952 года. Ім прадугледжвалася дасягнуць за пяцігоддзе ў прамысловым развіцці краіны наступных асноўных паказчыкаў: валавая прадукцыя прамысловасці павінна была павялічыцца ў параўнанні з 1950 годам на 66 %; магутнасць электрастанцый намячалася нарасціць у 2,1 раза, а выпрацоўку электраэнергіі – у 2,3 раза. Прадугледжвалася пашырэнне БелДРЭС, Баранавіцкай, Брэсцкай і Гродзенскай электрастанцый, заканчэнне будаўніцтва Гомельскай, Бабруйскай, Вілейскай, Мінскай і Полацкай электрастанцый і Асіповіцкай гідраэлектрастанцыі; увядзенне ў дзеянне ЦЭЦ у Пінску, Жыткавічах, Брагіне, Глыбокім і іншых гарадах.

Прагназаваўся вельмі значны рост аб'ёму капітальных укладанняў. У міністэрствах рэспубліканскага падпарадкавання яны намячаліся ў памеры 4,5 млрд рублёў, або на 53,5 % больш за фактычны аб'ём за папярэднюю пяцігодку, а ў саюзна-рэспубліканскіх ведамствах чакаўся рост на 60,3 %. Планаваўся ўвод жылога фонду ў аб'ёме 2,8 млн $м^2$, увесь жылы фонд павінен быў павялічыцца на 38,4 %. Было вырашана арганізаваць вытворчасць шэрагу новых відаў прамысловай прадукцыі: матацыклаў, катлоў, каналізацыйных труб, хімічных угнаенняў, баваўняных тканін.

Вялікія задачы намячаліся па далейшым развіцці лёгкай і харчовай прамысловасці. Аб'ём іх вытворчасці павінен быў узрасці на 68 і 60 % адпаведна. Было прызнана неабходным пабудаваць новыя кансервавыя, крухмальныя, хлебныя і піваварныя заводы, восем мясакамбінатаў і пяць птушкакамбінатаў *[4, с. 166–167]*.

Базай развіцця беларускай прамысловасці ў новай пяцігодцы сталі станоўчыя вынікі, дасягнутыя ёю ў папярэдняй пяцігодцы. Пры гэтым галоўнай крыніцай развіцця па-ранейшаму была праца рабочых і служачых, іх працоўны энтузіязм.

Важным сродкам павелічэння прамысловай вытворчасці заставалася сацыялістычнае спаборніцтва, якое было адным з найважнейшых ідэалагічных метадаў у тым ліку і ў эканоміцы. 22 верасня 1951 года ЦК КП(б)Б прыняў пастанову «Аб сацыялістычным спаборніцтве ў прамысловасці, на будаўніцтве і транспарце рэспублікі». У ёй адзначалася, што ў прамысловасці Беларусі ўзніклі новыя, больш дасканалыя формы і метады стаханаўскай працы, расце спаборніцтва працоўных калектываў за атрыманне звання перадавой брыгады, цэха і прадпрыемства. У ходзе сацыялістычнага спаборніцтва за паспяховае выкананне вытворчых планаў разгарнуўся рух за выпуск прадукцыі высокай якасці, зніжэнне яе кошту, за эканомію сыравіны, матэрыялаў, электраэнергіі, паліва, за комплексную механізацыю і аўтаматызацыю вытворчасці, за ўкараненне хуткаснай апрацоўкі металу. Пастанова абавязала партыйныя, прафсаюзныя, камсамольскія арганізацыі і гаспадарчыя органы «палепшыць кіраўніцтва сацыялістычным спаборніцтвам, устараніць фармалізм у гэтай справе, забяспечыць актыўны ўдзел усіх рабочых, спецыялістаў у сацыялістычным спаборніцтве, аказваць паўсядзённую дапамогу тым, хто спаборнічае, у выкананні імі сваіх абавязацельстваў, шырэй распаўсюджваць вопыт перадавых прадпрыемстваў і наватараў вытворчасці, усяляк падтрымліваць каштоўныя пачынанні, якія нараджаюцца

падчас сацыялістычнага спаборніцтва, дамагчыся, каб адстаючыя работнікі, брыгады, цэхі, прадпрыемствы падніманіся да ўзроўню перадавых, маючы на ўвазе, што сацыялістычнае спаборніцтва як камуністычны метад будаўніцтва павінна стаць магутным сродкам новага ўздыму ўсіх галін народнай гаспадаркі і на гэтай аснове – далейшага павышэння матэрыяльнага дабрабыту працоўных» *[5, с. 411–412]*.

Выконваючы пастанову ЦК КП(б)Б, Беларускі рэспубліканскі савет прафсаюзаў у канцы красавіка 1952 года правёў у Мінску сход маладых рабочых па абмене вопытам працы токара Мінскага трактарнага завода Паўла Арахоўскага – ініцыятара спаборніцтва за эканомію інструмента на кожнай вытворчай аперацыі, якое разгарнулася ў 1952 годзе на прамысловых прадпрыемствах краіны. Такія ж сходы праводзіліся і ў іншых гарадах, пачын Арахоўскага падтрымалі на многіх прадпрыемствах Беларусі. Ужываючы яго метад, калектывы аўтамабільнага, трактарнага і матавелазавода (да 1951 года Мінскі веласіпедны завод) зэканомілі за адзін год больш за 2 млн рублёў.

Шырокі размах у краіне атрымаў рух за падаўжэнне тэрміна службы прыстасаванняў, ініцыятарам якога была свідравальшчыца Мінскага аўтазавода Н. Камінская *[6, с. 542; 7, с. 308; 8, с. 454; 9, с. 308–309]*.

У 1952 годзе ў Беларусі ў сацыялістычным спаборніцтве ўдзельнічала 94,9 % рабочых і служачых прамысловасці, транспарту і будаўніцтва. Толькі за званне брыгад выдатнай якасці ў тым годзе спаборнічала 9,6 тыс. брыгад. Гэта ганаровае званне было прысвоена 2021 брыгадзе, 60 зменам, 15 цэхам і двум прадпрыемствам *[9, с. 311]*. Працоўныя намаганні рабочага класа давалі станоўчыя вынікі. У 1951 годзе план вытворчасці валавой прадукцыі прамысловасцю БССР быў выкананы на 103 % *[9, с. 306]*. У параўнанні з 1950 годам прамысловая вытворчасць узрасла на 17 %, перасягнуўшы ўзровень даваеннага 1940 года на 35 % *[10, с. 24]*. У 1951 годзе ў лік дзеючых увайшлі такія буйныя прадпрыемствы прамысловасці, як першы ў краіне цукровы завод у Скідзелі, падшыпнікавы завод, новы радыёзавод і ЦЭЦ-3 у Мінску, будаваліся Мінскі гадзіннікавы завод і камвольны камбінат, а таксама шэраг іншых прадпрыемстваў. Поруч з будаўніцтвам новых пашыраліся і рэканструяваліся на высокай тэхнічнай аснове дзеючыя фабрыкі і заводы. Толькі станкабудаўнічая прамысловасць пачала выпускаць каля 150 новых відаў станкоў і абсталявання *[6, с. 539; 7, с. 292; 11, с. 135; 12, с. 371]*. Па выніках 1951 года даваеннага ўзроўню дасягнула прамысловасць Гомельскай вобласці *[13, арк. 7]*. Працягвала нарошчваць свой патэнцыял прамысловасць Віцебскай вобласці, аднак на даваенны ўзровень вытворчасці яна выйшла толькі ў 1954 годзе *[13, арк. 7]*.

У 1952 годзе план дзяржаўнай прамысловасці быў выкананы на 103,4 %, кааператыўнай прамысловасці – на 101,1 % *[9, с. 311]*. Аб'ём прамысловай вытворчасці ў краіне перавысіў паказчык папярэдняга года на 16 %, а даваенны ўзровень – на 56 % *[10, с. 24]*. У 1952 годзе пачалі выпускаць прадукцыю Бабруйскі завод натуральнага каўчуку, Лепельскі льнозавод, Магілёўскі рэгенератарны завод і многія іншыя новыя прадпрыемствы. Гэта быў значны прырост для Беларусі.

Істотную ролю ў нарошчванні прамысловага патэнцыялу краіны ў першыя гады пятай пяцігодкі стала адыгрываць далейшае тэхнічнае пераўзбраенне прамысловасці, капітальнага будаўніцтва. Так, буйны камвольны камбінат, будаўніцтва якога пачалося ў Мінску ў 1951 годзе і які павінен быў спецыялізавацца на вырабе розных тканін і прадзіва, аснашчаўся самым новым на той час тэхналагічным абсталяваннем.

Вынікам унясення ў вытворчы працэс значных тэхналагічных змен, устаноўкі аўтаматычных ліній, мадэрнізацыі галоўнага канвеера на Мінскім трактарным заводзе стаў выпуск у жніўні 1951 года першай партыі тралёвачнага трактара КТ-12 для лясной прамысловасці, а ў кастрычніку 1953 года – першай партыі колавага трактара «Беларусь», прызначанага для выканання розных сельскагаспадарчых работ.

У ажыццяўленні тэхнічнага пераўзбраення прамысловасці, капітальнага будаўніцтва Беларусь абапіралася на эканамічную магутнасць усяго СССР. З Масквы, Ленінграда, прамысловых цэнтраў Паволжа, Урала, Украіны наша краіна атрымлівала розныя віды прамысловага абсталявання, якое не выраблялася ў БССР, а таксама сталь, чыгун, вугаль, нафту, трубы, рэйкі і многае іншае.

Са свайго боку Беларусская ССР уносіла немалы ўклад у развіццё народнай гаспадаркі іншых рэспублік Савецкага Саюза. У канцы 1940-х – пачатку 1950-х гадоў Беларусь прыняла актыўны ўдзел у будаванні Сталінградскай, Куйбышаўскай, Кахоўскай электрастанцый, Волга-Данскога канала і іншых буйных новабудоўляў. Наша краіна пасылала туды магутныя самазвалы, трактары, станкі, лесаматэрыялы, розныя будаўнічыя матэрыялы, кадры рабочых і спецыялістаў. Толькі на будаўніцтве Волга-Данскога канала працавала каля 1 тыс. мінскіх аўтасамазвалаў, якія перавозілі каля 30 % усіх грузаў. Парк аўтасамазвалаў у ліпені 1952 года, калі былі скончаны работы, склаў 28,8 % ад усёй колькасці машын, на іх долю прыпадала 36,5 % агульнай грузападымальнасці парку аўтасамазвалаў *[11, с. 135–136, 139–140]*.

У першыя гады пятай пяцігодкі развіццё галін прамысловасці Беларусі па-ранейшаму адбывалася нераўнамерна: выраб сродкаў вытворчасці, як і ў папярэдняй пяцігодцы, рос хутчэй, чым вытворчасць прадметаў спажывання. Калі агульны аб'ём прадукцыі машынабудавання і металаапрацоўкі ў краіне за 1951 год павялічыўся на 33 %, то лёгкай прамысловасці – на 21 %, харчовай прамысловасці – на 14 % *[10, с. 185, 311, 409]*. У 1951 годзе лёгкая і харчовая прамысловасць не выканалі планаў па асартыменце, асобныя прадпрыемствы выпускалі прадукцыю нізкай якасці *[9, с. 307]*. XX з'езд КП(б)Б, які адбыўся 20–23 верасня 1952 года, канстатаваў, што Міністэрствам мяса-малочнай прамысловасці БССР у 1951 годзе не выкананы заданні па вытворчасці масла, а таксама «ў рэспубліцы недастаткова выпрацоўваецца тавараў шырокага спажывання, прадметаў хатняга і гаспадарчага ўжытку з мясцовай сыравіны». І ў сувязі з гэтым з'езд ставіў задачу «забяспечыць далейшае павелічэнне вытворчасці прадметаў масавага спажывання, будаўніцтва новых і пашырэнне існуючых прадпрыемстваў лёгкай і харчовай прамысловасці па выпуску баваўняных тканін, трыкатажу, абутку, штучнага валакна, а таксама будаўніцтва цукровых, маслабойных, агароднінасушыльных заводаў, прадпрыемстваў кандытарскай, кансервавай, піваварнай, вінаробнай, мясной, рыбнай, масларобчай і сыраварнай прамысловасці. На прадпрыемствах лёгкай і харчовай прамысловасці шырока ўкараняць аўтаматызацыю і механізацыю працэсаў вытворчасці, дамагаючыся далейшага паляпшэння якасці і павелічэння асартыменту харчовых і прамысловых тавараў» *[5, с. 435, 441]*.



**На будаўніцтве Прывакзальнай плошчы ў Мінску. 1952 год**




**Найлепшыя будаўнікі Баранавіцкага аблтрэста на ўзвядзенні жылога дома ў г. Баранавічы. 1951 год**

Пры гэтым найбольш высокія тэмпы развіцця прадугледжваліся зноў жа для вядучай галіны цяжкай прамысловасці – машынабудавання «як асновы далейшага тэхнічнага прагрэсу народнай гаспадаркі». З'ездам намячалася «прыняць меры да поўнага асваення вытворчых магутнасцей аўтамабільнага, трактарнага, мотавеласіпеднага заводаў і іншых прад-прыемстваў машынабудавання і металаапрацоўкі». Ставілася таксама задача забяспечыць высокія тэмпы развіцця энергетыкі, тарфяной прамысловасці, прамысловасці будаўнічых матэрыялаў. Пры гэтым упор рабіўся на будаўніцтва і ўвядзенне ў эксплуатацыю новых прамысловых аб'ектаў – цеплавых электрастанцый і гідрастанцый, цеплаэлектрацэнтралей і цепласетак, прадпрыемстваў па хімічнай перапрацоўцы торфу, заводаў па вырабу металічных і зборных жалезабетонных канструкцый і інш., на аснашчэнне іх новым абсталяваннем, якое дазваляла павысіць узровень механізацыі і аўтаматызацыі вытворчых працэсаў *[5, с. 448–450, 461]*.

Выкананне пастаўленых XX з'ездам КП(б)Б задач па развіццю лёгкай і харчовай прамысловасці дзякуючы намаганням рабочых і служачых дазволіла гэтым галінам дасягнуць даваеннага ўзроўню вытворчасці ў 1952–1953 гадах *[14, с. 72]*. Агульны аб'ём прадукцыі лёгкай прамысловасці БССР у 1951 годзе ў параўнанні з 1940 годам склаў 87 %, у 1952 годзе – 95 %, у 1953-м – 110 %, харчовай прамысловасці – адпаведна 97, 113 і 128 % *[10, с. 311, 409]*.

## Дэфіцыт неабходных тавараў і жылля

Нягледзячы на дасягненне лёгкай і харчовай прамысловасцю Беларусі даваеннага ўзроўню, невялікія тэмпы росту вытворчасці прадметаў спажывання па-ранейшаму накладвалі негатыўны адбітак на ўзровень матэрыяльнага дабрабыту насельніцтва нашай краіны. Хоць савецкая прапаганда апошніх гадоў сталінізму яшчэ больш нястрымна трубіла аб тым, што «жыць стала лепш, жыць стала весялей», насамрэч жыццё народа было шмат у чым не такім, як яго падносіла ўлада, добра дасведчаная аб рэальным становішчы спраў. Адно з вельмі паказальных сведчанняў таму – матэрыялы аддзела Савета Міністраў БССР па праверцы работы дзяржаўных органаў «па пытанні гандлю ў Ляхавіцкім раёне Баранавіцкай вобласці» за 10 месяцаў 1953 года, якія паказваюць «колькасць» і якасць гандлёвага абслугоўвання насельніцтва раёна. У інфармацыі аддзела аб выніках праверкі, накіраванай намесніку Старшыні Савета Міністраў нашай краіны У.Г. Кудраеву, указвалася, што ў раёне «ўлік вывучэння попыту на тавары адсутнічае. Кіраўнікі гандлёвых прадпрыемстваў не заўсёды забяспечваюць насельніцтва неабходнымі таварамі.

Дрэнна забяспечваюцца работнікі і спецыялісты машынна-трактарных станцый. Пры МТС адчынены ларкі па продажу харчовых і прамысловых тавараў. Аднак асартыментны мінімум у іх вельмі малы. Адсутнічаюць у продажы: папяросы, газа, гатовыя сукенкі. Маюць месца частыя перабоі ў продажы печанага хлеба і амаль адсутнічае ў продажы белы хлеб.

Характэрна адзначыць, што ў магазіне Ганчароўскай МТС маюцца ў продажы папяросы «Баян» па 7 руб. 90 кап. пачак і гнілыя папяросы «Казбек» і «Дели», а іншых папярос, на якія ёсць вялікі попыт, як «Север», «Волна», «Прибой», «Беломор канал», у продажы магазіна не бывае. Адсутнічаюць зусім у продажы крупяныя і макаронныя вырабы.

Загадчык Падлескага сельскага прадуктовага магазіна т. Кумейша груба ставіцца да пакупнікоў, прадае гнілыя папяросы «Беломор канал» і «Неман». Магазін знаходзіцца ў антысанітарным стане, наяўныя прадукты пакрыліся пластамі пылу…

Нездавальняюча арганізаваны гандаль у саўгасе «Нача». Памяшканне, якое займае магазін, вельмі маленькае, няма магчымасці завезці тавараў згодна з асартыментным мінімумам.

У горадзе Ляхавічы адсутнічаюць спецыялізаваныя магазіны па продажу хлеба, у выніку чаго хлеб прадаецца ў харчовых магазінах…

На базары ад чайнай райспажыўсаюза адчынены буфет, у якім у продажы ёсць гарэлка, а для закусак – толькі цукеркі. Водпуск гарэлкі і віна робіцца без мензуркі…»

У гаспадарчым магазіне Ляхавіцкага райспажыўсаюза ў продажы «адсутнічае віконнае і лямпавае шкло, няма колавай мазі, саней, цвікоў ад нумара сто і вышэй, на скаргі і прапановы пакупнікоў не рэагуюць…

Дырэктар раймага т. Будкова М. І. прадае мужчынскія шапкі-вушанкі, на якіх прымацаваны цэтлікі з цэнамі да ўцэнкі…» *[15, арк. 123–126]*.

Паводле афіцыйнай савецкай статыстыкі, у канцы 1952 года – пачатку 1953 года ў Беларускай ССР пры выхадзе лёгкай і харчовай прамысловасці ў цэлым на даваенны ўзровень вытворчасць многіх харчовых і нехарчовых тавараў не дасягнула гэтага ўзроўню. У ліку такіх тавараў былі мяса, каўбасныя, хлебабулачныя вырабы, крупы, алей, гарэлка і лікёра-гарэлачныя вырабы, мыла, ільновалакно прамысловай апрацоўкі, баваўняныя тканіны, скураны і валяны абутак, панчошна-шкарпэткавая прадукцыя, бялізнавы трыкатаж, некаторыя віды мэблі (сталы, крэслы, канапы, ложкі металічныя і інш.), сшыткі вучнёўскія і інш. *[10, с. 318, 327, 345, 359, 394, 405, 415, 429, 433, 436, 443, 450]*. Пры гэтым калі на канец 1940 года ў краіне працавала 18 728 прадпрыемстваў рознічнага гандлю, то на канец 1952 года – толькі 16 511 *[3, с. 258–259]*.

Не хапала ў Беларусі ў гады разглядаемага перыяду не толькі прадметаў спажывання. Нягледзячы на далейшы рост жыллёвага будаўніцтва (у Мінску, напрыклад, ужо ў пачатку 1952 года 80 % жыллёвага фонду належала пасляваенным забудовам *[16, с. 354]*), па-ранейшаму назіраўся дэфіцыт жылля. У сувязі з гэтым Савет Міністраў БССР і ЦК КП(б)Б былі вымушаны прыняць 18 сакавіка 1952 года пастанову



**Бярозаўская ГРЭС. 1962 год**

«Аб неадкладных мерах па перасяленню сем'яў, якія пражываюць у зямлянках, у добраўпарадкаваныя дамы ў гарадах Беларускай ССР у 1952 годзе», у якой адзначылі, што ў гарадах БССР «да гэтага часу яшчэ значная колькасць сем'яў знаходзіцца ў цяжкіх жыллёвых умовах», пражываючы ў зямлянках, хлявах і падвалах разбураных будынкаў, і пастанавілі выдзеліць 10 млн рублёў з расходнай часткі бюджэту краіны на 1952 год для перасялення такіх сем'яў у жылыя дамы. Пастанова абавязвала кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў, гаспадарчых арганізацый і ведамстваў завяршыць перасяленне ўсіх сем'яў рабочых і служачых сваіх прадпрыемстваў, якія пражываюць у зямлянках, у добраўпарадкаваныя дамы да 1 верасня 1952 года *[17, арк. 141–143]*. Тым не менш на верасень 1952 года толькі ў Мінску ў зямлянках і іншых неспрыяльных для жылля памяшканнях туліліся 452 сям'і *[18, арк. 342]*.

Нягледзячы на пэўнае паляпшэнне забяспечанасці насельніцтва Беларусі камунальнымі паслугамі (у гарадах павялічвалася працягласць водаправоднай і каналізацыйнай сістэм, наладжвалася работа транспарту, пераважна аўтобуснага, у Мінску ў 1952 годзе пайшоў першы ў краіне тралейбус, паляпшалася добраўпарадкаванне гарадоў, іх санітарны стан і г. д.), іх узровень заставаўся нізкім. Асабліва слаба былі забяспечаны імі жыхары вёсак. У дрэнным становішчы знаходзілася дарожная гаспадарка, дарогі з асфальтавым пакрыццём у сельскай мясцовасці былі рэдкай з'явай *[16, с. 354–355 ]*.

Трэба адзначыць, што ў разглядаемы перыяд партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва СССР і саюзных рэспублік аказвала на планавыя органы ціск з мэтай павышэння планавых заданняў развіцця прамысловасці, забеспячэння ў планах «няўхільнага» нарошчвання аб'ёмаў прамысловай вытворчасці, «ні ў якім разе не дапушчаючы зніжэння іх у параўнанні з фактычна дасягнутым узроўнем папярэдняга перыяду» *[19, арк. 12]*. Аднак, нягледзячы на гэта, прынятыя павышаныя планы часта не выконваліся, асабліва за першы квартал года, што сведчыла аб праблемах з эфектыўнасцю эканамічнага развіцця і схаваных дыспрапорцыях. У прынятай на пасяджэнні Дзяржплана БССР 14 сакавіка 1953 года пастанове па разгледжаным пытанні выканання народнагаспадарчага плана за студзень – люты 1953 года адзначалася «крайне нездавальняючае выкананне плана прамысловай вытворчасці» за гэты перыяд: на 88,7 % – у цэлым па БССР, у тым ліку на 88,5 % – саюзна-рэспубліканскімі міністэрствамі і ведамствамі і на 87 % – рэспубліканскімі міністэрствамі і ведамствамі. У выніку ў пастанове канстатавалася: «Дзяржаўная планавая камісія лічыць такое становішча з выкананнем дзяржаўнага плана за студзень і люты месяцы недапушчальным» *[20, арк. 57–58]*.

Дасягалася выкананне высокіх заданняў гадавых планаў па прыросце прамысловай прадукцыі пераважна за кошт больш значных тэмпаў росту капітальных укладанняў, уводу ў строй новых аб'ектаў і агрэгатаў, а не павышэння прадукцыйнасці працы, г. зн. за кошт пераважна колькаснага (экстэнсіўнага), а не якаснага (інтэнсіўнага) росту. Гэта мадэль эканамічнага развіцця – спробы значнага павелічэння прамысловай вытворчасці (пераважна цяжкай прамысловасці) за кошт фарсіраванага нарошчвання капіталаўкладанняў – пераважала ў апошнія гады разглядаемага перыяду. У тым ліку, як паказвае прыведзены намі канкрэтна-гістарычны матэрыял, і ў Беларусі. Да правядзення такой палітыкі кіраўніцтва СССР у значнай меры падштурхоўвала неабходнасць нарошчвання ваенных выдаткаў, звязаных з вайной у Карэі і планамі пераўзбраення ва ўмовах халоднай вайны армій еўрапейскіх сацыялістычных краін – удзельніц будучай Арганізацыі Варшаўскай дамовы, асноўны цяжар якіх нёс СССР. Пасля смерці І.В. Сталіна новае кіраўніцтва СССР пачало карэкціроўку гэтага курсу, адмовіўшыся ад многіх амбіцыйных планаў і праграм *[4, с. 166–172]*.

Такім чынам, развіццё прамысловасці Беларускай ССР у пачатку 1950-х гадоў адбывалася ў рэчышчы тэндэнцый папярэдняга перыяду. Пры выкананні плана новай, пятай пяцігодкі, як і раней, першарадная ўвага надавалася цяжкай індустрыі. Выпуск тавараў народнага спажывання лёгкай і харчовай прамысловасцю адставаў ад планавых заданняў і патрэб насельніцтва. У выніку ўзровень матэрыяльнага дабрабыту людзей заставаўся невысокім, задавальняючы ў асноўным толькі самыя неабходныя патрэбы.

Фактычна ў 1951–1953 гадах у прамысловасці БССР працягнулася індустрыялізацыя, распачатая да Вялікай Айчыннай вайны, метады яе ажыццяўлення былі лагічным працягам даваеннай мадэлі мабілізацыйнай,

**дырэктыўна-планавай эканомікі. Аднак рэсурсаў для вырашэння ўсіх неабходных задач не хапала, таму гэты дэфіцыт пераадольвалі, з аднаго боку, за кошт узмацнення адміністрацыйнага механізму планавання і кантролю, з другога – за кошт нізкіх тэмпаў росту ўзроўню жыцця насельніцтва і ідэалагічных метадаў (такіх, як сацыялістычнае спаборніцтва) вырашэння эканамічных праблем.**

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 10.02.2023 г.*

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Народное хозяйство БССР: стат. сб. / Центр. стат. упр. при Совете Министров БССР. – Минск: Госиздат БССР, 1963. – 511 с.
2. Сообщение Государственного планового комитета СССР и Центрального статистического управления СССР «Об итогах выполнения четвертого (первого послевоенного) пятилетнего плана СССР на 1946–1950 годы» // Правда. – 1951. – 17 апреля.
3. Народное хозяйство Белорусской ССР: стат. сб. / Стат. упр. Белорусской ССР. – М.: Госстатиздат, 1957. – 319 с.
4. Министерство экономики Республики Беларусь: история и современность / А.В. Червяков [и др.]; редкол.: В.Г. Гусаков [и др.]. – Минск: Беларуская навука, 2021. – 638 с.
5. Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК (1918–1975): в 6 т. / Ин-т истории партии при ЦК КПБ. – Минск: Беларусь, 1983–1987. – Т. 4: 1945–1955. – 1986. – 616 с.
6. История Белорусской ССР: в 2 т. / Акад. наук БССР, Ин-т истории; под общ. ред. Л.С. Абецедарского [и др.]. – 2-е изд., доп. – Минск: Академия наук БССР, 1961. – Т. 2. – 702 с.
7. История рабочего класса Белорусской ССР: в 4 т. / Акад. наук БССР, Ин-т истории; гл. редкол.: П.Т. Петриков (пред.) [и др.]. – Минск: Наука и техника, 1984–1987. – Т. 3: Рабочий класс БССР накануне и в годы Великой Отечественной войны, в период упрочения и развития социалистического общества (1938–1960) / А.Е. Козловская [и др.]. – 1985. – 485 с.
8. Очерки истории Коммунистической партии Белоруссии: в 2 ч. / Ин-т истории партии при ЦК КПБ – Филиал Института марксизма-ленинизма при ЦК КПСС. – Минск: Госиздат БССР, Беларусь, 1961–1967. – Ч. 2 (1921–1966). – 1967. – 586 с.
9. Очерки истории профсоюзов Белоруссии (1905–1969) / Л.П. Липинский [и др.]. – Минск: Беларусь, 1970. – 474 с.
10. Промышленность Белорусской ССР: стат. сб. / Центр. стат. упр. при Совете Министров БССР. – Минск: Беларусь, 1976. – 478 с.
11. Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т. / Акад. навук БССР, Ін-т гісторыі; гал. рэдкал.: І.М. Ігнаценка (старш.) [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1972–1975. – Т. 5: Беларуская ССР у перыяд стварэння развітога сацыялістычнага грамадства і будаўніцтва камунізму (1945–1974 гг.) / С.Д. Вайтовіч [і інш.]. – 1975. – 776 с.
12. Экономика Советской Белоруссии. 1917–1967 / Акад. наук БССР, Ин-т экономики; редкол.: Ф.С. Мартинкевич (отв. ред.) [и др.]. – Минск: Наука и техника, 1967. – 571 с.
13. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 30. Воп. 6. Спр. 299.
14. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Современная школа, Экоперспектива, 2000–2011. – Т. 6: Беларусь у 1946–2009 гг. / Л. Лыч [і інш.]. – 2011. – 728 с.
15. НАРБ. – Ф. 7. Воп. 4. Спр. 3134.
16. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / Акад. навук БССР, Ін-т гісторыі; рэдкал.: М.П. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларусь, 1994–1995. – Ч. 2 / М.П. Касцюк [і інш.]. – 1995. – 560 с.
17. НАРБ. – Ф. 7. Воп. 4. Спр. 123.
18. НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 2. Спр. 219.
19. НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 81. Спр. 169.